*Л. У. Ляховіч,*
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі*
*і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# МАНАРХІ ДЫНАСТЫІ РАМАНАВЫХ: АЦЭНКІ І СПРЭЧКІ ВА ЎМОВАХ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ І НАВУКОВЫХ ЗМЕН МЯЖЫ XX–XXI ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Умовы постсавецкага грамадства выклікалі да жыцця шэраг сацыякультурных змен, якія паўплывалі і на гістарыяграфію. Знікла цікавасць да класавай барацьбы, на змену рэвалюцыйным настроям прыйшлі традыцыяналісцкія ідэі, і цэнтральнае месца ў даследаваннях заняла ўлада як самагодны феномен.

Расійскае самадзяржаўе, як сацыякультурны феномен, персаніфікаваная ўлада, увасабленне некалі страчанай традыцыі, прыцягнула да сябе самую моцную ўвагу. На хвалі ідэйнага размежавання, расчараванняў і духоўных пошукаў з’явілася ідэя вяртання да манархічнай дзяржаўнасці, заснаванай на рэлігійным фундаменце. Неаманархізм, неаеўразійства, сакралізацыя ўлады, цікавасць да самадзяржаўя сталі фактарамі пошуку новага ўвасаблення нацыянальнай ідэі для часткі расійскага грамадства. Больш за тое, дадзеныя з’явы стала прадметам навуковага аналізу [1–3].

Істотна змянілася ацэнка манархаў дынастыі Раманавых, якія сталі аб’ектамі «псіхагісторыі», «гісторыі паўсядзеннасці», «мікрагісторыі», «гісторыя эліт» і г. д. Красамоўным паказчыкам паварота адносін да Раманавых з’яўляецца неаднаразовае перавыданне біяграфій расійскіх манархаў у серыі «Жизнь замечательных людей».

Адным з самых яскравых прыкладаў ідэйных і канцэптуальных змен з’яўляецца першы нумар часопіса «Родина» за 1993 г., прысвечаны 380-годдзю Дома Раманавых. Уражвае спектр праблем, якія разглядаліся вучонымі-гісторыкамі: ад аналізу феномена манархіі да публікацыі споведзі тых, хто расстраляў царскую сям’ю . Аднак самае галоўнае – гэта партрэтная галерэя Раманавых з

характарыстыкай кожнага манарха ў форме анкеты, адказы на якую давалі прафесійныя гісторыкі. У гэтым жа нумары ў рубрыцы «Пункт гледжання» абмяркоўвалася праблема: ці патрэбна сённяшняй Расіі манархія?

У 2001 г. выйшла калектыўная манаграфія «Еўрапейскія манархіі ў мінулым і сучаснасці. XVIII–XX стагоддзі» [4], дзе Раманавым было адведзена значнае месца. Сімптаматычным было ўключэнне ў зборнік артыкула духоўнай асобы – протаіерэя Аляксандра Шаргунова, аб адраджэнні маральнасці і дзяржаўнасці як перадумовах аднаўлення праваслаўнай манархіі. Аўтар сцвярджае: «Нет никакой иной истории, кроме истории спасения, которая завершается в вечности. Царь – помазанник Божий – призван обеспечить это в максимальной степени» [5, с. 216]. Такія выказванні ў навуковым выданні сведчаць аб істотных ідэйных зрухах, хаця рэдкалегія і адзначыла, што не падзяляе пункт гледжання аўтара [4, с. 4].

Асобную ўвагу гісторыкаў прыцягнулі да сябе два расійскія манархі з тытуламі Вялікіх – Пётр I і Кацярына II. Вось красамоўная ацэнка Пятра I, сфармуляваная ў працы «Імператарская Расія»: «Опросы общественного мнения показывают, что среди выдающихся деятелей России у Петра Великого нет соперников: он один привлекает более 50 процентов общественных симпатий… Это значит, что люди признают необходимость мирных реформ и ненужность революции. В любви к первому императору видно и сожаление об исчезнувшей империи… Здесь и восхищение людей сильной личностью, хозяином, ведшим народ вперед. А более всего здесь – преклонение перед безупречной государственной репутацией Петра Великого, который… жил только ради России, ради ее будущего» [6, с. 164].

Кацярына II, якая, па словах расійскага гісторыка А. Б. Каменскага, у савецкай гістарыяграфіі была не вартая добрага слова [7, с. 12], у постсавецкай аказалася настолькі папулярнай, што, на думку яшчэ аднаго даследчыка яе эпохі П. У. Сцегнія, «трудно сыскать даже потаенный уголок великой жизни, куда бы не заглянул пытливым взором отечественный или зарубежный историк» [8, с. 3]. Гэта зразумела, калі ўлічыць не толькі маштаб дзейнасці імператрыцы, але і яе біяграфію і яскравыя асабістыя якасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ацэнкі манархаў XIX ст. ужо не такія роўныя, і чым бліжэй да 1917 г., тым больш праяўляецца ідэйнае размежаванне сярод гісторыкаў. Узрастае як псіхалагізм вобразаў, так і эмоцыі ў адказах на балючыя пытанні, сярод якіх галоўнае: чаму адбыліся Люты і Кастрычнік 1917 года? Не выпадкова таму разыходжанні трактовак гісторыкаў-прафесіяналаў, яскрава бачныя ў адносінах да Аляксандра III, дасягаюць максімума пры ацэнцы асобы і дзейнасці яго сына – імператара Мікалая II.

Аляксандр III у вачах постсавецкіх гісторыкаў, зразумела, не зрабіўся інтэлектуалам ці крэатыўнай асобай, аднак сімпатыі да гэтага цара ўзраслі. Так, контррэформы сталі называцца «кансерватыўнай мадэрнізацыяй», калі ўлада звярнулася «к традиционным ценностям, и во внутриполитическом курсе получили распространение идеи… основанные на обновленной трактовке триады православие, самодержавие, народность» [9, с. 6].

Найбольшая апалагетыка Аляксандра III, падчас якога Расія набыла «спакой і ўпэўненасць», гучыць у працах расійскага гісторыка манархічнага накірунку А. М. Боханава. Ніякіх «контррэформ» не было, цар проста паспрабаваў «націснуць на тормазы», а такія людзі, як К. П. Пабеданосцаў і Д. А. Талстой былі патрэбныя Расіі [10, с. 291–302]. «Сакральная природа монархии четко очерчивала возможности политического маневра системы… Русский царь – понятие религиозное… Религиозный же авторитет не подлежит реформированию» [10, с. 470]. Кнігі А. М. Боханава востра палемічныя і накіраваныя супраць ліберальнай ідэі як у мінулым, так і цяпер.

Вакол асобы апошняга расійскага імператара, якому прысвечана мноства прац, ідуць не толькі гістарычныя, але і палітычныя баталіі. Мікалай, улічваючы яго кананізацыю, таму можа лічыцца ўнікальнай персналіяй. Танальнасць прац аб Мікалаі II, вагаецца ад стрымана-крытычных (Я. С. Радцыг [11] , В. Г Малышава [12] да апалагетычных (А. М. Боханаў [13; 14]). Адпаведна, ступень псіхалагізму і жадання спасцігнуць «праўду цара» і яго ўнутраны свет значна вышэйшая ў працах А. М. Боханава, але патрэбна рабіць папраўку на яго манархічныя ідэі. Адной жа з самых паспяховых прац, якая спалучае разважлівы падыход і псіхалагізм у стварэнні партрэта Мікалая II, з’яўляецца яго біяграфія, створаная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

С. Л. Фірсавым [15].

Такім чынам, у спалучэнні з метадалагічнымі інавацыямі і аксіялагічнымі зменамі новае стаўленне да Раманавых увасобілася ў адраджэнні традыцыяналізму, манархічных настрояў, цікавасці да манархіі і паважлівых адносін да яе носьбітаў, а таксама прыкметным удзелам у абмеркаванні гэтых праблем прадстаўнікоў праваслаўнай царквы.


1. *Гусев, И. В.* Монархическое направление русской социально-политической мысли XIX – XX веков : автореф. дис. ... канд. филос. наук : 09. 00. 03. / И. В. Гусев; ТГУ. – Тверь, 2005. – 19 с.

2. *Асонов, Н. В.* Политические доктрины российского самодержавия: генезис, эволюция и современный дискурс : автореф. дис. ... д-ра полит. наук : 23. 00. 01. / Н. В. Асонов; РАГС. – М., 2009. – 42 с.

3. *Захарова, Т. И.* Сакрализация власти как фактор трансформации современной России : автореф. дис. ... канд. политолог. наук. : 23. 00. 02. / Т. И. Захарова ; Саратовский гос. ун-т. – Саратов. 2009. – 20 с.

4. Европейские монархии в прошлом и настоящем. XVIII–XX века. – СПб. : Алетейя ; М. : ИВИ РАН, 2001. – 302 с.

5. *Шаргунов, А., прот.* Последний русский император и перспективы восстановления православной монархии в России / протоиерей Александр Шаргунов // Европейские монархии в прошлом и настоящем. XVIII–XX века. – СПб. : Алетейя ; М. : ИВИ РАН, 2001. – С. 208–217.

6. *Анисимов, Е. В.* Императорская Россия / Е. В. Анисимов. – СПБ : Питер, 2008. – 640 с.

7. *Каменский, А. Б.* «Под сению Екатерины». Вторая половина XVIII века. / А. Б. Каменский. – СПБ : Лениздат, 1992. – 448 с.

8. *Стегний, П. В.* Хроники времен Екатерины II / П. В. Стегний. – М. : Олма-Пресс, 2001. – 511 с.

9. *Гриценко, Н. Ф.* Консервативная стабилизация в России в 1881 – 1894 годах: Политические и духовные аспекты внутренней политики / Н. Ф. Гриценко. – М. : Русский путь, 2000. – 240 с.

10. *Боханов, А. Н.* Император Александр III / А. Н. Боханов. – 5-е изд. – М. : Рус. слово – РС, 2009. – 512 с.

11. *Радциг, Е. С.* Николай II в воспоминаниях приближенных / Е. С. Радциг // Новая и новейшая история. – 1999. – № 2. – С. 134–146.

12. *Малышева, О. Г.* Думская монархия: рождение, становление, крах. / О. Г. Малышева. – М. : Изд-во РАГС, 2001. – Ч. 1. Власть и зарождение Государственной думы – 194 с.

13. *Боханов, А. Н.* Сумерки монархии / А.Н. Боханов. – М. : Воскресенье, 1993. – 394 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Боханов, А. Н.* Император Николай II/ А.Н. Боханов. – 3-е изд. – М. : Русское слово – РС, 2004. – 568 с.
15. *Фирсов, С. Л.* Николай II: Пленник самодержавия / С. Л. Фирсов. – М. : Мол. гвардия, 2010. – 526 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ